Раённыя Будні



Судья Николай Репиха: «Слушать сердцем, решать по закону»

1 783

02.10.2015 Автор: Katrin

Суддзя Пружанскага раёна Мікалай Віктаравіч Рэпіха ў асаблівым прадстаўленні не мае патрэбы. Прысвяціўшага юрыдычнай рабоце на Пружаншчыне больш трыццаці гадоў жыцця, правёўшага тысячы судовых пасяджэнняў, яго, вопытнага юрыста, не ведае хіба толькі выпадковы ў нашым райцэнтры чалавек. Сваю юрыдычную дзейнасць пачынаў натарыусам, быў суддзёй і старшынёй суда. У 2000 годзе Прэзідэнтам нашай краіны яму адзінаму ў нашым раёне была прысвоена кваліфікацыя суддзі першага класа.



—Але ж, Мікалай Віктаравіч, суддзёй Вы маглі наогул не стаць…

—Фізкультуру і спорт любіў з дзяцінства. Таму пасля заканчэння вясковай школы ў Драгічынскім раёне нават меркаваў паступаць у інстытут фізкультуры. Падкачала здароўе.

Але перад тым, як канчаткова вызначыцца з прафесійным выбарам, давялося папрацаваць і настаўнікам фізкультуры, і нават начальнікам радыёстанцыі ДТСААФ (гады тэрміновай службы ў радах Савецкай Арміі не прайшлі бясследна). А неўзабаве пад уражаннем ад расказаў дваюраднага брата, які ў той час працаваў у Расіі старшынёй суда, паступіў на эканоміка-прававы факультэт Калінінградскага ўніверсітэта.

У 1979 годзе ў якасці натарыуса я прыбыў у Пружанскі раён.

25 ФЕВРАЛЯ 2024 ГОДА ЕДИНЫЙ ДЕНЬ ГОЛОСОВАНИЯ
Центральная избирательная комис Республики Беларусь
2023 ГОД МИРА И СОЗИДАНИЯ
Брестоблимущество
УСЛУГ АРЕНД новый автоб Автопарк №11 г. Пружан
БЕЛГОССТРА Представительство по Пружанскому району

ПОДПИШИТЕСЬ НА НАС

—Судовыя справы можна параўнаць з журналісцкімі артыкуламі. Напісаныя за столькі гадоў, іх ужо не падлічыш… І ўсё ж, самыя цікавыя справы ўспомніце?

—Як правіла, гэта найбольш складаныя з іх. Крымінальныя справы, калі даводзіцца разглядаць забойствы і згвалтаванні. Нядаўна ў мяне была палітычная, надзвычай рэзанансная справа. Цяпер – махлярства, дзе па сарака эпізодах праходзяць шаснаццаць пацярпелых. Разглядаць іх няпроста найперш у псіхалагічным плане.

—Дагэтуль прапускаеце чужы боль праз сябе?

—Так было, пакуль не набыў адпаведны прафесійны вопыт. Цяпер, адкінуўшы эмоцыі, навучыўся кіравацца выключна розумам. Бо галоўнае – прыняць правільнае рашэнне. Асабліва з вялікай асцярожнасцю, надзвычай абдумана стаўлюся да прыняцця рашэнняў па справах у дачыненні непаўналетніх. Калі ад цябе залежыць будучыня чалавека, шабляй махаць нельга.

—Ну, а хоць нешта прыемнае ў Вашай рабоце здараецца?

—Прыемнае, калі разглядаеш справы аб усынаўленні ці ўдачарэнні. Калі разумееш, што даеш шанц дзецям адчуць сябе шчаслівымі.

—Мікалай Віктаравіч, а Вам бывае шкада абвінавачваемых ці, магчыма, наадварот, хацелася б пакараць віноўніка больш сурова?

—Бывае. Як правіла, пашкадаваць хочацца ціхіх, простых людзей, якія пакорліва прымаюць, калі можна так сказаць, удары лёсу.

А бывае наадварот: па-чалавечы разумею, што за ўчыненае злачынства проста недастаткова прадугледжанага законам пакарання.

Як у першым выпадку, калі стаўлю сябе на месца абвінавачваемага, так і ў другім, калі адчуваю сябе пацярпелым, слухаю не толькі сваё сэрца, але і розум. Аднак… Ёсць верхавенства закона, якім суддзя павінен кіравацца. Ёсць выпадкі, калі можна не пагаджацца з мерай пакарання па тым ці іншым артыкуле крымінальнага ці адміністрацыйнага заканадаўства, але змяніць нешта ўжо не магчыма.

—Акрамя работы, што ў сваім жыцці Вы лічыце галоўным?

—Сям'ю і сяброў, якія дораць душэўны спакой, заўсёды зразумеюць, дапамогуць і ніколі не здрадзяць.

—У сувязі з асабістымі святамі людзям прынята нешта жадаць добрага і пазітыўнага. А што б Вы, Мікалай Віктаравіч, самі сабе пажадалі з нагоды юбілею?

— Пабываўшы на аперацыйным стале, зразумеў сапраўдную цану здароўю. Таму не толькі сабе, але і сваім родным найперш жадаю моцнага здароўя. А таксама дабрабыту і задаволенасці жыццём. Калі так будзе ва ўсіх людзей, паменшае спраў і ў судах.

Інтэрв'ю ўзяла Галіна Каляда.

Категория ***Профессия***

РУБРИКИ САЙТА

Выберите рубрику

СВЕЖИЕ ПУБЛИКАЦИИ

15.12.2023

На едином портале электронны услуг расширится перечень административных процедур, осуществляемых Госпогранкомитетом

15.12.2023

Ці запрацуе ліфт у водным палацы?

15.12.2023

Большой рождественско-новогодний концерт «HAPPY NE YEAR» от Брестской областной филармонии пройдёт в Пружана 11 января

15.12.2023

Свята запальвання агеньчыкаў галоўнай навагодняй ёлцы Руж адбудзецца 16 снежня

14.12.2023

Святочнае адкрыццё навагодня ёлкі адбудзецца 15 снежня ў пасёлку Сонечным

ГОД МІРУ І СТВАРЭННЯ



Свята запальвання агеньчыкаў на галоўна навагодняй ёлцы Ружа адбудзецца 16 снежня

15.12.2023



Святочнае адкрыццё навагодняй ёлкі адбудзецца 15 снежня пасёлку Сонечным

14.12.2023



Падведзены вынікі шахматна-шашачнага турніру на прызы газет «Раённыя будні»

14.12.2023



Азы робататэхнікі і LEC канструявання асвойваюць вучні СШ М імя ЧБВА дзякуючы рабоце STEM-кабінета

14.12.2023

одноклассники

‹ **Предыдущая запись**
Светлана Еремеева: «Успеха без труда не бывает»

Следующая запись ›
Выборы-2015: 6 октября начинается досрочное голосование

ДОБАВИТЬ КОММЕНТАРИЙ

Ваш адрес email не будет опубликован. Обязательные поля помечены *

Комментарий

Имя*

Email*

Сайт

Отправить комментарий



Міжнароднаму Дню памяці ахвяраў генаць было прысвечана мерапрыемства ў пружанскім каледжы

13.12.2023

БЕЛТА ТЕМА НЕДЕЛИ

15-12-2023

"Невероятная, но осознанная близорукость". Политолог объяснил, почему Запад укрывает нацистов

15-12-2023

Уголовное дело в отношении палача Хатыни Катрюка направлено в суд

15-12-2023

Богатырева: тесное сотрудничество в IT-сфер способствует развитию научно-технологическ базы СГ

15-12-2023

Информационный пресс-центр ЦИК заработа Малом зале Дворца Республики 24 февраля

15-12-2023

В Закарпатье депутат взорвал гранаты во вре сессии: сам погиб, еще 26 человек пострадал

15-12-2023

В Беларуси началась внезапная проверка дежурных сил ВВС и ПВО

НОВОСТИ ПРЕДОСТАВЛЕНЫ БЕЛТА ©

ГЛАВНЫЙ РЕДАКТОР

Ильющенко Виктор Михайлович

8-01632-4-02-80

КОНТАКТЫ

Наш адрес:
г. Пружаны. ул. Красноармейская, д. 78

ПОДПИСКА



Падведзены вынікі шахматна-шашачнага турніру на прызы газеты «Раённыя будні»

14.12.2023

Карэспандэнт «Раённых будняў» «згуляў галавой»

САМОЕ КОММЕНТИРУЕМОЕ

Расписание движения поездов по железнодорожной станции Оранчицы + расписание движения автобусов по маршруту Пружаны-Оранчицы-Пружаны + изменение графика движения автобусов по маршруту Пружаны — Засимовичи и Пружаны —

КАЛЕНДАРЬ

Декабрь 2023

Пн	Вт	Ср	Чт	Пт	Сб	
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	1
11	12	13	14	15	16	1
18	19	20	21	22	23	2
25	26	27	28	29	30	3

« Ноя

E-mail редакции:
RRBud2@brest.by

Приём рекламы:
8-01632-4-03-60, 8-01632-4-03-55

Бухгалтерия:
8-01632-4-03-60

Ответственный секретарь:
8-01632-4-01-08

Корреспонденты:
8-01632-4-03-02,
8-01632-4-03-55,
8-01632-3-58-81



на тэлеканале «Беларусь 5». Чакаем эфіру праграмы!

07.12.2023

Клепачи (действует с 10 декабря 2023) (15)

Расписание движения городских автобусов по остановочным пунктам (4)

720
449
369

© 2017 Пружаны | «Раённыя будні» | Все права защищены.